УДК 1(476)(091)+2(476)

**Старасценка Віктар Уладзіміравіч**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
starostenko@msu.by

# РЭЛІГІЙНА-ПАЛІТЫЧНЫ ЗМЕСТ СТАРАЖЫТНАРУСКАГА ПАДАННЯ ПРА АПОСТАЛА АНДРЭЯ ПЕРШАЗВАНАГА

*Разглядаецца рэлігійна-палітычны аспект падання пра місію апостала Андрэя Першазванага. Паказана, што яно служыла спосабам сцвярджэння незалежнасці хрысціянскай Русі, садзейнічала станаўленню вялікадзяржаўнай ідэалогіі Расіі, даказвала рэлігійна-культурную самадастатковасць ўсходніх славян.*

**Ключавыя словы:** Андрэй Першазванны, праваслаўе, Русь, ідэалогія, усходнія славяне.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*The religious and political aspect of the legend about the mission of the Apostle Andrew the First-Called is considered. It is shown that it served as a way to assert the independence of Christian Rus, contributed to the formation of a great-power ideology of Russia, and proved the religious and cultural self-sufficiency of the Eastern Slavs.*
**Keywords:** Andrew the First-Called, Orthodoxy, Russia, ideology, Eastern Slavs.

У рэлігійна-культурнай спадчыне ўсходніх славян асаблівае месца займае паданне пра апостала Андрэя Першазванага. Андрэя як аднаго з дванаццаці вучняў Ісуса Хрыста ўпершыню нагадваюць Евангелля ад Матфея і паводле Яна, з III ст. яго згадвалі хрысціянскія пісьменнікі, у IX ст. было складзена жыціе апостала [1, с. 91-95]. Місіянерскае служэнне Андрэя абмяжоўвалася ў гэтых крыніцах усходняй часткай Рымскай імперыі, што з багаслоўскага пункту гледжання трактавалася як апостальскае хрышчэнне Візантыі. Пазней узнікае новая, «руская» версія падання пра апостала. Геаграфія яго місіянерства істотна пашырылася, ахапіўшы і тэрыторыю Прыдняпроўя. У найбольш старажытных помніках айчыннай пісьменства паданне пра Андрэя з'яўляецца ва ўступнай частцы «Аповесці мінулых гадоў». Згадваючы пра абвяшчэнне апосталам Евангелля ў Паўночным Прычарнамор'і, летапісец дадае, што той «… проиде въ вустье Днѣпрьское, и оттоле поиде по Днѣпру горѣ… и ста подъ горами на березѣ. И… рече к сущимъ с нимъ ученикомъ: "Видите ли горы сия – яко на сихъ горахъ восияеть благодать божья; имать градъ великъ быти и церкви многи богъ въздвигнути имать". И въщедъ на горы сиа, благослови я, и постави крестъ…иде же послѣже бысть Киевъ…» [2, с. 12].

Старажытная Русь здабыла, такім чынам, свайго «уласнага апостала». Паданне пра наведванне «Рускай зямлі» Андрэем падкрэслівала асаблівае месца Русі ў хрысціянскім свеце, яе богаабранасць [3, с. 31-34], даказвала старажытнасць рускага праваслаўя і сцвярджала «сцвярджала аўтарытэт Кіева як духоўнай мітраполіі «Усея Русі»« [4, с. 450]. Асоба Андрэя падыходзіла для гэтага ідэальна – ён разглядаўся не проста адным з вучняў Хрыста, а «Першазваным» – першым, каго Ісус заклікаў да апостальскага служэння (Евангелле паводле Яна, 1:41) [5, с. 81]. Гэтыя абставіны мелі для праваслаўя надзвычайную актуальнасць у святле размежавання ў 1054 г. з каталіцызмам. Асабліва паважаны каталікамі апостал Пётр з'яўляўся другім з «прызваных» Ісусам пасля свайго старэйшага брата Андрэя (Евангелле паводле Яна, 1: 41-42).

Казанне пра Андрэя Першазванага знаходзіла падтрымку ў Канстанцінопалі, для якога мела і багаслоўска-тэарэтычнае, і практычнае палітычнае значэнне. Візантыя імкнулася з яго дапамогай не толькі засце-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рагчы сябе ад «рымскіх дамаганняў», але і зацвердзіць ідэю свайго сваяцтва з Руссю, умацаваць царкоўную залежнасць Кіеўскай мітраполіі ад Канстанцінопаля. У пасланні імператара Міхаіла VII Дукі (1072–1077) да князя Усевалада адзначалася, што «нашы дзяржавы абодзве маюць нейкую крыніцу і корань, што адны і тыя ж ... веснікі абвясцілі ў іх слова Евангелля» [6, с. 5].

У Старажытнай Русі пазіцыя Візантыі ўспрымалася неадназначна. На поле рэлігійна-палітычнай ідэалогіі сфармаваліся «візантыйская» і «руская» «партыі». Прызнаючы дагматычную агульнасць з Канстанцінопалем, яны разыходзіліся ў пытанні аб статусе Кіеўскай мітраполіі: ідэолагі «рускай партыі» (Іларыён Кіеўскі і інш.) выступалі за царкоўную самастойнасць Русі. Дадзеная пазіцыя была характэрна і «Аповесці мінулых гадоў». Казанне пра Андрэя Першазванага было накіравана, па сутнасці, супраць прэтэнзій грэцкай царквы, ідэйна ўмацоўвала царкву рускую, яе роўны царкоўны статус. Яшчэ адным аспектам было супрацьдзеянне каталіцкаму Рыму, які дабіваўся ператварэння Русі ў «лен святога Пятра» [7, с. 46].

Казанне пра Андрэя Першазванага на працягу стагоддзяў выкарыстоўвалася ў рэлігійных і палітычных інтарэсах ўсходніх славян. У Расіі яно садзейнічала станаўленню вялікадзяржаўнай ідэалогіі, з ім узгаднялася канцэпцыя «Масква – Трэці Рым». Заслугоўвае ўвагі адказ Івана Грознага на прапанову езуіта А. Пасевіно аб заключэнні, па прыкладзе грэкаў, царкоўнай уніі паміж Масквой і Рымам. Ён заўважыў, што «грэкі для нас не евангелле... Мы атрымалі веру пры пачатку хрысціянскай царквы, калі Андрэй, брат ап[остала] Пятра, прыходзіў у гэтыя краіны, каб прайсці ў Рым... Мы ў Маскве прынялі хрысціянскую веру ў той жа час, як вы ў Італіі...» [8, с. 49].

Казанне аб апостальскім хрышчэнні культывавалася і багаслоўскай думкай беларуска-украінскай Русі. У адрозненне ад Расіі, дзе праваслаўе з'ўлялася дзяржаўнай рэлігіяй, і з 1589 г. набыло форму аўтакефальнага Маскоўскага Патрыярхату, беларуска-украінская праваслаўная супольнасць існавала ў поліканфесійнам грамадстве Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, дзе ролю дзяржаўнай рэлігіі выконваў рымакаталіцызм. Адносная верацярпімасць змянілася ў XVI ст. феадальнакаталіцкай Контррэфармацыяй, увядзеннем Брэсцкай царкоўнай уніі (1596). У гэтых умовах асаблівую актуальнасць набыла праблема абароны нацыянальна-культурнага і рэлігійна-царкоўнага суверэнітэту. Праваслаўныя аўтары ўсё часцей звяртаюцца да гістарычнай спадчыны, вытокаў веравызнаўчых традыцый Русі. Так, «Палінодзія» З. Ка-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пысценскага ўтрымоўвала спецыяльны раздзел «Аб зацності і мужнасці народу Расійскага», прысвечаны гісторыі старажытных славян. Аўтар заклікае пазнаваць «даўніну», свой радавод, ганарыцца сваім «слаўным і моцным народам Расійскім», якому спрыяў сам Гасподзь. Менавіта Бог упаўнаважыў «апостала Рускага» Андрэя Першазванага дараваць Русі «сапраўдную», праваслаўную веру [9, с. 966–1107]. Апавяданне «Як Андрэй Апостал прыйшоў у Кіеў град да няслушных» быў уключаны і ў Загароўскі паэтычны зборнік: *«Из Иерусалима в Византию дойде и оттуда паки во Россию прииде... На горах Киевских молитву сотворив, дабы там Господь благодать отворив... Дабы вже бездушным престала офера и православная возсияла вера. Вострубив начало проповед тую и принес в Россию новину благую»* [10, с. 187–189].

Запазычанае з «Аповесці мінулых гадоў» паданне пра апостала пераследвала ідэалагічную мэту – даказаць незалежны ад каталіцкага Захаду рэлігійна-культурны статус праваслаўнай «Русі». Гэтая ідэя выконвала істотную ролю ў выхаванні нацыянальна-патрыятычных пачуццяў беларуска-украінскага насельніцтва Рэчы Паспалітай. Ва ўмовах узмацніўшагася шанавання Андрэя Першазванага на саборы Кіеўскай мітраполіі 1621 г. было ўсталявана царкоўнае свята ў гонар апостала. У дзеяннях сабора адзначалася, што «... Расея не менш за іншых усходніх народаў, бо ў ёй прапаведаваў апостал» [8, с. 49-50]. З часу «Патэрыкона» (1635) магілёўскага епіскапа (пазней – мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі) Сільвестра Косава місія Андрэя Першазванага стала разглядацца першым з пяці этапаў хрысціянізацыі Русі, якую працягнулі Кірыл і Мяфодзій, князі Аскольд і Дзір, княгіня Вольга і князь Уладзімір [11, с. 448–472].

Казанне пра апостала Андрэя не абмяжоўвалася рамкамі багаслоўскай і палітычнай думкі, прысутнічала ў гістарычнай свядомасці даволі шырокіх слаёў грамадства. Пра гэта сведчыць Магілёўская хроніка мяжы XVII–XVIII стст. [12, с. 173]. Пераказ гісторыі «нашага слаўнага горада Магілёва» храніст пачынае з эпохі Старажытнай Русі, з хрысціянскай місіі Андрэя Першазванага ў «краях Расейскіх, якія Руссю клічуцца». Старажытнарускае паданне дапаўняецца ў яго рэдакцыі істотнай дэталлю: апостал падчас свайго падарожжа благаславіў «і горы, на якіх і Магілёў» [13, с. 239; 14, с. 133]. Тым самым гісторыя горада звязваецца з біблейскімі часамі, яго ўзнікненне набывае сакральнае паходжанне [15, с. 85; 16, с. 72]. Калі ў «Аповесці мінулых гадоў» легенда пра апостала Андрэя сцвярджала аўтарытэт хрысціянскай Русі, у З. Капысценскага і ў Загароўскім зборніку даказвала рэлігійна-культурную самастойнасць беларуска-украінскай Русі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў каталіцкай Рэчы Паспалітай, то Т. Сурта выкарыстоўвае гэты сюжэт і для праслаўлення Магілёва як сваёй «малой радзімы».

**Літаратура**

1. Макарий. История Русской Церкви / Макарий : в 7 кн. – М. : Изд-во Спасо-Преображенского Валаамского монастыря, 1994. – Кн. 1. – 408 с.

2. Повесть временных лет. – М. – Л. : Изд-во АН СССР, 1950. – Ч. 1 : Текст и перевод. – 406 с.

3. Старостенко, В. В. Сказание об Андрее Первозванном в отечественной мысли XI–XVII веков / В. В. Старостенко // Мінулая і сучасная гісторыя Магілева : зб. навук. прац. – Магілёў, 2001. – С. 31–34.

4. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 1. Эпоха Сярэднявечча / В. Б. Евароўскі [і інш.]; рэдкал.: В. Б. Евароўскі [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 574 с.

5. Христианство : энциклопедический словарь : в 3 т. – М. : Большая Российская энциклопедия, 1993. – Т. 1. – 863 с.

6. Русская Православная Церковь 988–1988 : очерки истории I–XIX вв. – М. : Издание Московской Патриархии, 1988. – Вып. 1. – 112 с.

7. Замалеев, А. Ф. Восточнославянские мыслители : эпоха Средневековья / А. Ф. Замалеев. – СПб. : Изд-во СПбГУ, 1998. – 270 с.

8. Карташев, А. Собрание сочинений : в 2 т. Очерки по истории русской церкви / А. Карташев. – М. : ТЕРРА, 1992. – Т. 1. – 686 с.

9. Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Петербург : Тип. А.Траншеля, 1878. – Кн. 1 (Русская историческая библиотека. Т. 4). – 1448 с.

10. Саверчанка, І. В. Старажытная паэзія Беларусі / І. В. Саверчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 254 с. – Дадатак.

11. Архив Юго-Западной России. – Киев : Типо-лит. Н. Т. Корчак-Новицкого, 1914. – Ч. 1. – Т. 8. – II, 12, 798 с.

12. Старостенко, В. В. Общественная и философская мысль в Беларуси X–XVII вв. / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2005. – 216 с.

13. Полное собрание русских летописей. – М. : Наука, 1980. – Т. 35. – 308 с.

14. Старостенко, В. В. Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII вв.) / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2001. – 200 с.

15. Марзалюк, І. А. Магілёў у XII–XVIII стст. Людзі і рэчы / І. А. Марзалюк. – Магілёў ; Мінск : Веды, 1998. – 260 с.

16. Старостенко, В. В. Общественно-философская мысль и национальное самосознание белорусов XVI–XVII вв.: очерки истории / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 1999. – 112 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова